У. Караткевічу, В. Быкаву, Е. Лось, Р. Барадуліну, сябрам, калегам З. Канапельцы, Д. Сімановічу, М. Цішачкіну, У. Папковічу.

Літаратуразнаўца В. Русілка, характарызуючы паэзію А. Канапелькі, адзначыла: "Невыпадкова ў гэтым светлым і лёгкім, як узмах крыла, імені – Анатоль Канапелька – прыцішана гучыць мелодыя мудрага і спакойнага анапеста, самага «інтэлігентнага» з вершаваных памераў, найбольш прыдатнага для філасофскай элегіі ці малітвы" [2, с. 4 ]. У лірыцы позняга часу, прасякнутай магістральнымі радкамі "Я кожны дзень сябе знаходжу…" шмат філасофскіх рэфлексій, медытатыўнай танальнасці. Элегічныя вершы-роздумы ("Яшчэ адна восень паляцела ў вырай", "Не трэба чалавеку адзіноты", "Не хавайце сваіх усмешак", "Лістапад", "Адыходзяць сябры адыходзяць") звернуты да вечных ісцін і каштоўнасцей, вялікай стваральнай сілы прыгажосці і дабра. Несумненна, значныя набыткі паэта і ў асэнсаванні тэмы кахання. Інтымная лірыка А. Канапелькі акрэслівае характэрную асаблівасць яго героя – вернасць пачуццю, павагу да жанчыны. Унікальная з'ява ў беларускай паэзіі – любоўныя вершы прысвечаны адзінаму каханню – жонцы Святлане. Вобразы прыроды гарманічна спалучаюцца з пачуццямі закаханых у вершах "Зорка Святлана", "Завея круціць, як прадонны вір", "Маёй любові снежны зарапад", "Любімая, не трэба сумаваць". Вобраз вечна летняга эдэмскага сада персаніфікуецца ў вобраз беларускага зімовага сада, над якім "…любові ціхі зарапад // плыве ў прасторы хараства зямнога" [с. 57]. Праз усю творчасць А. Канапелькі праходзіць лейтматыў вернасці рамантычным ідэалам гуманізму і прыгажосці.

**Заключэнне.** Такім чынам, адметнасцю семантыка-эстэтычнага поля пэзіі А. Канапелькі з'яўляецца выверанае, устойлівае захаванне і працяг класічных традыцый беларускай нацыянальнай паэзіі. Паэт таленавіта, па-мастацку аб'яднаў у сваёй лірыцы грамадзянска-публіцыстычныя і філасофска-медытатыўныя матывы, прадэманстраваў высокае майстэрства стварэння паэтычнага вобраза, сімвала, мастацкай дэталі, разнастайных прыёмаў і сродкаў. Зманлівая прастата традыцыйных памераў яго лірыкі хавае ў сабе глыбокі духоўны сэнс і сапрўдную эстэтычную культуру, выяўляе дакладную кардыяграму жыцця паэта, здольнага на глыбокае самавыяўленне.

Спіс літаратуры

1. Канапелька, А. Жыццё прадоўжыцца ў песні / А. Канапелька. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава". – 2010. – 73 с.
2. Русілка, В. Самыя добрыя песні / В. Русілка // Віцебскі рабочы. – 1994. – 30 лістапада. – С.7.

## ФУНКЦЫЯНАВАННЕ АГУЛЬНАСЛАВЯНСКІХ ПРОЗВІШЧНЫХ ТЫПАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА

*К.А. Сасноўская*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Структура сучаснага прозвішча ўяўляе сабой суадносіны прозвішчнай асновы і прозвішчнага фарманта. Фінальныя элементы сучаснага прозвішча мы будзем называць антрапафармантам (па азначэнню Н.У. Падольскай) [5]. Як слушна заўважае ў сваёй манаграфіі Г.М. Мезенка, фінальныя элементы, якія паўтараюцца (у тым ліку і суфіксы), валодаюць пэўным анамастычным значэннем: яны сведчаць, што гэта не ўласнае імя, не імя па бацьку, а прозвішча ці мянушка [2, с. 79].

Набор агульнаславянскіх прозвішчных фармантаў аднолькавы па ўсёй Беларусі. Актуальным уяўляецца выдзеліць рэгіянальную сістэму агульнаславянскіх прозвішчаў сярод астатніх.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей функцыянавання агульнаславянскіх прозвішчных тыпаў на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна.

**Матэрыял і метады.** Матэрыял даследавання – прозвішчы жыхароў Бешанковіччыны (2700 адзінак). У ходзе аналізу фактычнага матэрыялу выкарыстоўваліся метады лінгвістычнага апісання, параўнальна-супастаўляльны, у тым ліку элементы арэальнага і статыстычнага.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да агульнаславянскіх прозвішчных тыпаў належаць тып на **-оў/-еў/-аў**, **-ін/-ын**, тып на **-скі/-цкі**, тып на **-іч/-ыч/-ыц**, тып на **-ак/-як**, тып на **-ік/-ык/-чык**, тып на **-ец/-эц**, **-авец**.

Да прозвішчаў на **-оў/-еў/-аў** М.В. Бірыла далучыў тып на **-ін/-ын**, паколькі "яны маюць аднолькавую матывацыю – утвараюцца ад імені ці імені-мянушкі бацькі суфіксам *-оў/-еў/-аў* ад



Репозиторий ВГУ

назоўнікаў мужчынскага роду на зычны, а суфіксам *-ін/-ын* ад назоўнікаў жаночага роду і назоўнікаў мужчынскага роду на -а" [1, с.40]. Гэтай жа думкі прытрымліваецца і беларускі даследчык А.Ф. Рогалеў, які адзначае, што дадзены тып прозвішча з'яўляецца самым старажытным, бо ўсталяваўся з сярэдзіны XVI стагоддзя. У той час патранімічныя прозвішчы з фармантамі *-оў/-еў, -ін/-ын* выконвалі функцыю імён па бацьку – указвалі на прыналежнасць чалавека пэўнаму бацьку (Пятроў – "сын Пятра", Шубін – "сын Шубы"). Прозвішчы на -оў/-еў/-аў і -ін/-ын А.Ф. Рогалеў адносіць да рускага тыпу. Па падліках С.І. Зініна на тэрыторыі Расіі яны складаюць 19,5% і 6% адпаведна [6, с. 59].

Населеныя пункты Бешанковіцкага раёна знаходзяцца ў зоне найбольшага распаўсюджання дадзенага тыпу – на поўначы ад Оршы да самага Віцебска. Вёска Астроўна размешчана бліжэй да гэтай зоны і колькасць прозвішчаў на *-оў/-еў/-аў і -ін/-ын* тут складае 57,9% , на *-ін/-ын* – 8,3%. Самыя распаўсюджаныя антрапонімы на гэтай тэрыторыі наступныя: *Арлоў, Аляксееў, Аўчыннікаў, Гаранін, Зайцаў, Мельнікаў, Нікіцін, Рыбакоў, Яршоў.*Прозвішчы *Алешкін, Васькін, Гаўрылкін, Марынкін* з'яўляюцца адлюстраваннем яркай гістарычнай рысы Расіі XVI – XIX стст. Па словах У.А. Ніканава, усіх непрывілеяваных іменавалі абавязкова зняважлівым фармантам -к(а). З болем і гневам пісаў пра гэта В.Г. Бялінскі: "Расія ўяўляе сабою жудаснае відовішча краіны, дзе людзі самі сябе называюць не імёнамі, а мянушкамі: Ванькамі, Васькамі, Сцешкамі, Палашкамі" ("Ліст да Гогаля"). Прозвішчаў, якія ўтварыліся ад такіх формаў, было асабліва шмат сярод прыгоннага насельніцтва [4, с.199].

Прозвішчны тып на **-скі/-цкі** ў Бешанковіцкім раёне, як і на тэрыторыі Беларусі ўвогуле, займае другое месца. Найбольш пашыраны такія прозвішчы ў Гродзенскай, Мінскай і заходняй частцы Віцебскай абласцей. У асноўным большая частка такога тыпу прозвішчаў утворана ад тапонімаў: *Арлоўскі* < Арлова, *Дамарацкі* < Дамарады, *Дзятлоўскі* < Дзятлава. У розных населеных пунктах колькасць іх вагаецца ад 7% да 11%: Астроўна – 7,4% , Бачэйкава – 11,8% , Бешанковічы – 9,4%, Верхняе Крывіна – 11,5% , Дразды – 7,6% , Свяча – 7,8% , Ула – 10,6%.

Прозвішчы на **-овіч/-эвіч/-евіч/-авіч**, **-іч/-ыч/-ыц** маглі ўтварацца ад поўных і скарочаных форм старажытных славянскіх мужчынскіх імён, размоўна-бытавых і скарочаных форм імён: *Барысевіч* – ад Барыс, *Лосіч* – ад Лось, *Цяцерыч* – ад Цяцера. Антрапонімаў названага тыпу налічваецца няшмат (7-9%). Гэта тлумачыцца тым, што прозвішчы з такімі фармантамі па частотнасці ўжывання ўваходзяць у паўночна-заходні арэал Беларусі, дзе іх колькасць складае 5–10%.

Прозвішчы на **-ак/-як** не вельмі распаўсюджаны як па Беларусі ўвогуле, так і на даследаванай тэрыторыі. Фармант *-ак/-як* мае патранімічнае і матранімічнае значэнне: пры яго дапамозе ўтвараліся прозвішчы ад імені ці мянушкі бацькі (найперш) або маці (рэдка): *Юрчак* (ад Юрка). Асноўны арэал дадзенага прозвішчнага тыпа сустракаецца на Брэстчыне. Агульная колькасць сабраных прозвішчаў – 1,4% , што ў чатыры разы менш, чым ва ўкраінскай мове.

Тып на **-ік/-ык/-чык** слаба прадстаўлены на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна. Прозвішчы з гэтым суфіксам генетыўна ўзыходзяць да дэмінутыўных форм, утвораных ад уласных асабовых імён і антрапонімаў апелятыўнага паходжання: *Козік, Мельнік, Новік, Рыбік, Царык* і інш. Найбольш часта яны распаўсюджаны на поўначы Брэстчыны і на поўдні Гродзеншчыны. Сярэдні паказчык па Беларусі складае 5%, што значна перавышае колькасць па ўсіх сямі населеных пунктах (1,9%). Гэта тлумачыцца тым, што населеныя пункты Бешанковіцкага раёна не ўваходзяць у асноўны арэал прадуктыўнасці прозвішчаў дадзенага тыпу па Беларусі.

Прозвішчны тып на **-ец/-эц, -авец** таксама з'яўляецца малавыражаным. У даследаваным іменніку яго паказчыкі наступныя: Астроўна – 0,8%, Бачэйкава – 3,1%, Бешанковічы – 2,2%, Верхняе Крывіна – 2,9%, Дразды – 1,9%, Свяча – 2,9%, Ула – 1,6%. Такія прозвішчы ўказвалі на месца пражывання або паходжання чалавека: *Косінец* < Косіна, *Кунахавец* < Кунахава, *Тоўпінец* < Тоўпіна, *Чачанец* < Чачаны; маглі мець суаднесенасць з уласнымі асабовымі мужчынскімі імёнамі: *Навумавец, Семянец, Сцепанец.* Па Беларусі прозвішчы гэтага тыпу размешчаны раўнамерна і складаюць 2,1% , што ў большай ступені адпавядае паказчыкам даследаванай тэрыторыі.

**Заключэнне.** Агульнаславянскія прозвішчы прадстаўлены на ўсёй тэрыторыі Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Сярод дадзеных тыпаў пераважаюць прозвішчы з антрапафармантамі на **-оў/-еў/-аў, -ін/-ын (47,9%),** што перавышае паказчыкі па Віцебшчыне (35,3%) і Беларусі ў цэлым (31,88%), і тып на **-скі/-цкі.** Намінацыі з антрапафармантамі **ец/эц, -авец** перавышаюць у два разы паказчыкі па Віцебшчыне. У астатнім колькасныя паказчыкі



Репозиторий ВГУ

агульнаславянскіх прозвішчных тыпаў Бешанковіцкага раёна супадаюць з паказчыкамі па Віцебшчыне і Беларусі ў цэлым.

Спіс літаратуры

1. Бірыла, М.В. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў. Даклады Х Міжнароднага з'езда славістаў / М.В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 63 с.
2. Мезенко, А.М. Антропонимное пространство Витебщины : монография / А.М. Мезенко, Т.В. Скребнева. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – 148 с.
3. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць : манаграфія / Г.М. Мезенка, В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. – Віцебск : Выд-ва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2006. – 238 с.
4. Никонов В.А. Словарь русских фамилий / В.А. Никонов. – М.: Школа-Пресс, 1993. – 224 с.
5. Подольская, Н.В. Словарь русской ономастической терминологии / Н.В. Подольская. 2-е изд., перераб. и доп. – М., 1988.
6. Рогалев, А.Ф. Введение в антропонимику. Именование людей с древнейших имён до XVIII века / Рогалев А.Ф. – Брянск, 2009. – 146 с.

## ЭВОЛЮЦИЯ ЛИЧНОСТНЫХ УСТАНОВОК В ДРАМАТУРГИИ ГАРОЛЬДА ПИНТЕРА

*О.Ф. Сенькова*
*Новополоцк, ПГУ*

Творческое наследие английского драматурга Гарольда Пинтера охватывает разнородные проявления жизни современного состояния общества: разобщенность людей (пьесы *«Комната»* (*The Room*, 1957), *«Сторож»* (*The Caretaker*, 1959), *«Пейзаж»* (*Landscape*, 1967)), дезориентацию в исторических перипетиях и военных конфликтах (пьесы *«Перед дорогой»* (*One For The Road*, 1984), *«Горский язык»* (*Mountain Language*, 1988)), утрату человеком собственного места в жизни (пьесы *«День рождения»* (*The Birthday Party*, 1957), *«Новый мировой порядок»* (*The New World Order*, 1991), *«Кухонный лифт»* (*The Dumb Waiter*,1957)).

Используя приёмы антитеатра (нагромождение ничего не значащих диалогов, безликость персонажей), опыт ибсеновско-чеховской традиции «действия за сценой» [1, 122], Пинтеру удается создать особую угнетающую атмосферу, где личные страхи персонажей передаются читателю и зрителю. Такое сочетание необъяснимого ужаса и бессознательного страха за сохранность собственной жизни воплотилось в уникальной драматургической модификации, получившей название «комедии угрозы» (*comedy of menace*). Однако для Гарольда Пинтера приём запугивания не является сосредоточением творческого мастерства писателя: главное для автора – заострить проблему, задеть воспринимающую сторону за живое. В связи с этим достаточно *актуальным* представляется изучение авторской концепции с позиций осмысления ценностных ориентиров, которыми руководствуется личность в современном течении жизни. Как отмечают исследователи современного состояния общества, «современная цивилизация выделяет свои приоритеты и систему стандартов, которые порождают новую культуру мышления, позволяющую формализовать отношение к реальности» [2, 198].

Цель работы – выявление приоритетов и стандартов, лежащих в основе мировоззрения современного человека и вычленение истоков формирования личностных установок в драматургии Гарольда Пинтера.

**Материал и методы.** Объектом исследования выступают как ранние пьесы Гарольда Пинтера *«Комната»* (*The Room*, 1957), *«День рождения»* (*The Birthday Party*, 1957), *«Оранжерея»* (*The Hothouse*,1958), так и драмы середины 1960-х гг. *«Вечернее чаепитие» (Tea Party,* 1964*), «Возвращение домой»* (*The Homecoming*, 1964). При помощи сравнительно-типологического и культурно-исторического методов нами выявлена основная смысловая и художественная организация пьес.

**Результаты и их обсуждения.** В пьесе *«Комната»* представлено бегство героини Роуз от собственного прошлого. Перед нами предстает женщина, которая тщательно оберегает хрупкую конструкцию вновь созданного мира. Она отреклась от своей семьи, тщательно замаскировавшись в образе заботливой жены и идеальной хозяйки. Окружив заботой Берта, своего мужа, Роуз отказывается признать своего отца, слепого афроамериканца. Гарольд Пинтер показывает бесперспективность попыток построить основы новой жизни без включения в такой процесс элемента прошлого. В качестве итога такого разрушительного построения нового мира автор изображает внезапную слепоту Роуз в финале пьесы.

Своё логическое продолжение данная проблема получает в более зрелой пьесе английского драматурга *«Подвал»*. Перед нами вновь замкнутое пространство: подвальное помещение маленькой квартирки. Сходным представляется и нагнетаемая автором атмосфера холода, без-



Репозиторий ВГУ